International Accountability Platform for Belarus

**ПЛАТФОРМА ПЕРАДАЛА ПРАКУРОРУ МКС ДОКАЗЫ ПАРУШЭННЯЎ У БЕЛАРУСІ**

Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (IAPB) прадставіла доказы і юрыдычны аналіз у Канцылярыю пракурора Міжнароднага крымінальнага суда (МКС) для папярэдняга вывучэння пытання аб тым, ці валодае Суд юрысдыкцыяй для расследавання і пераследу меркаваных злачынстваў супраць чалавечнасці, улучна з дэпартацыяй, пераследам і іншымі бесчалавечнымі актамі, здзейсненымі беларускімі высокапастаўленымі службовымі асобамі з 1 мая 2020 года.

У Паведамленні Платформы, прадстаўленым 31 студзеня 2025 года, выкладзены фактычны і юрыдычны аналіз доказаў, сабраных Платформай падчас інтэрв'ю са сведкамі і пацярпелымі, а таксама матэрыялаў з адкрытых крыніц, наяўных у калекцыі Платформы. Паведамленне было падрыхтаванае ў сувязі з перадачай Літвой пытання аб сітуацыі ў Беларусі Пракурору МКС 30 верасня 2024 года, і зваротам 13 праваабарончых арганізацый, разам з Платформай, да іншых дзяржаў-удзельніц МКС з заклікам далучыцца да яе.

"*Перадача Літвой справы ў МКС азначае сабой важную вяху на шляху да правасуддзя для пацярпелых ад злачынстваў супраць чалавечнасці ў Беларусі",* - сказала Андрэа Хубер, кіраўнік Платформы. – *"Дзякуючы стойкасці і мужнасці беларускіх пацярпелых і праваабаронцаў, а таксама камандзе Платформы, цвёрда намеранай дамагчыся змены сітуацыі, мы змаглі перадаць Пракурору МКС істотную інфармацыю і доказы для разгляду".*

Паведамленне Платформы, заснаванае на артыкуле 15 (2) Рымскага статута, змяшчае фактычныя звесткі, у тым ліку аб грамадзянскіх пратэстах і рэакцыі дзяржавы, жорсткім абыходжанні падчас пратэстаў, затрыманняў, ператрусаў і ўтрымання пад вартай, іншых парушэннях асноўных правоў, прымусовым выездзе грамадзянскіх асоб з Беларусі і парушэннях правоў чалавека пасля выезду з Беларусі. Акрамя таго, былі прадстаўлены юрыдычны аналіз пытанняў юрысдыкцыі, асноватворных актаў меркаваных злачынстваў супраць чалавечнасці і прымальнасці справы, а таксама адпаведныя дадаткі аб месцах утрымання пад вартай і дзяржаўных структурах у Беларусі.

Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці, кансорцыум беларускіх і міжнародных НДА, створаны ў 2021 годзе, займаецца зборам, кансалідацыяй, праверкай і захаваннем доказаў грубых парушэнняў правоў чалавека, якія з'яўляюцца злачынствамі па міжнародным праве, меркавана здзейсненых беларускімі ўладамі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх. База дадзеных Платформы змяшчае больш за 29 000 дакументаў, якія маюць дачыненне да 2 600 апытаных, і больш за мільён архіваваных матэрыялаў з адкрытых крыніц.

Акрамя гэтага Паведамлення ў МКС, Платформа прадставіла доказы, інфармацыю і аналітычныя матэрыялы пяці дзяржавам, механізмам ААН па прыцягненні да адказнасці і Маскоўскаму механізму АБСЕ, а таксама супрацоўнічала з юрыстамі і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці з мэтай прыцягнення да адказнасці асоб, якія здзейснілі міжнародныя злачынствы, і забеспячэння правасуддзя і кампенсацыі шкоды для пацярпелых у Беларусі.

"*Акрамя магчымага расследавання Міжнародным крымінальным судом, захоўваецца вострая неабходнасць барацьбы з беспакаранасцю таксама шляхам правядзення нацыянальных расследаванняў і судовага пераследу ў адпаведнасці з прынцыпам універсальнай юрысдыкцыі, з тым, каб забяспечыць перамогу правасуддзя.",* - заявіла Хубер. -- "*Платформа гатовая прадставіць доказы і аналіз нацыянальным пракурорам, якія вядуць расследаванне парушэнняў міжнароднага крымінальнага права ў Беларусі*".

**Па дадатковую інфармацыю просім звяртацца** да Андрэі Хубер, кіраўніцы Платформы, па адрасе anhu@dignity.dk.